БЕЛАРУСКАЯ ДУМКА

Цана нумэру 50 кап.

АБВЕСТКІ: 1 радок перад тэкстам 4 рублі.
1 радок за тэкстам 2 рублі.
3 безработных за ўсю абвестку 2 рублі.

ВЫХОДЗІЦЬ ТРОЙЧЫ У ТЫДЗЕНЬ.

Рэдакцыя і Адміністрацыя — **Востра-Брамская, № 9** — адчынена што дня, апрача сьвята, 8—12 і 3—5.

Год I. **Вільня, серада 28 мая 1919 г.** **№ 14.**

Хто прыезджае у Вільню і мае хоць капіуца часу пахваліцца сваімі мястовымі, месьцячковымі ці вясковымі навінамі; хто хоча сам даведацца аб патрэбных яму і грамадзе беларускіх справах і навінах ці дастаць беларускую літэратуру,— ніхай ен будзе ласкау не абмінуць сваю беларускую рэдакцыю.

Беларуская Рада

памяшчаецца на Востра-Брамскай вул. д. № 9.

Старшыня Рады прымае што дзень, апрача сьвят, ад 1 да 2.

Сэкрэтар прымае у панядзелак, сераду і пятніцу ад 3 да 4.

Сход віленскіх беларусаў.

Сход паказаў, што яшчэ ніколі беларусы не гарнуліся так адзін да аднаго, як у гэтую ліхую гадзіну. Сход паказаў, што яшчэ ніколі) ня было у беларусаў гэткай аднадушнасьці і аднагалоснасьці, як у гэты незвычайна адпаведны час. Відаць было, як выхварэла беларускае сэрца і як рупяцца беларусы паправіць старыя памылкі і жыць пановаму.

Многа чаго даў сход. Ужо не кажучы аб тым, што ён пакінуў па сабе Нацыянальны Комітэт, каторы сваёю працаю пакажа нам карыснасьць сходу, мы яшчэ маем колькі рэзолюцый, надта важных і вельмі справядлівых.

Віленскія беларусы ў адзін голас заявілі, што абароняць незалежнасьць і непадзельнасьць Бацькаўшчыны.

Што яны створаць сваё нацыянальнае войска. Гэта важнейшыя рэзолюцыі

А драбнейшыя ахапліваюць усе галіны палітычна - экономічнага жыцьця: вызваленьне арыштаваных, організацыя школ і тэатраў, разьвіцьце коопэратываў і г. д.

І толькі гэткая загана ёсьць сходу: ня было той жаданай поўнай самадзеяльнасьці грамады, аб якой мы раней пісалі. Ня было яе у поўнай меры.

Самая гушча грамады замнога маўчала, помала казала аб сабе. А павінна быць агульнае будаўніцтва, шырокая беларуская самадзеяльнасьць, бо вузкая „кружкоўшчына“, хоць-ба-ж і вельмі „сьвядомая“, цяпер можа быць толькі шкоднаю.

Што гэтага у віленскіх беларусаў, аднак, ня будзе, таму ёсьць парукаю абраны Комітэт, у склад каторага увайшлі прадстаўнікі самых розных беларускіх груп.

N.

Думкі беларуса.

Сучаснае неясняе палажэньне у палітыцы нашых прыяцелёў, каторая як быццам бы і ня хоча браць пад увагу беларускі народ і яго права на незалежнасьць, выклікае шмат думак, якія мы тутака і выкляруем.

Бальшавікі, прызнаўшы незалежнасьць Беларусі і даўшы нам быццам-то беларускі урад, зараз жа пастараліся як награду для сябе за гэную ласку—прылучыць да Маскоўшчыны беларускія зямлі Віцебшчыну і Магілеўшчыну.

Гэткая безцэрэмоннасьць адбылася проста, без пытаньня народа, ці гэтага хоча.

Нешта падобнае бачым са стараны Польшчы у стасунку да нас. Але культура культуры—не раўня. Польскія дзеячы нэрвова працуюць на нашай зямлі і уселякімі спосабамі стараюцца, каб народ высказываўся за Польшчу. Такім чынам ня зробіўшы поўнага плебісцыта (галасаваньня) паміж народам, адразу пастанаўляюць, што раз ёсьць людзі, каторыя хочуць быць з Польшчай, — дык і цэлы гэты край польскі.

Як вядома Польскі Сойм ужо прылучыў да Польшчы беларускія паветы Горадзеншчыны: Беластоцкі, Бельскі і Сакольскі. Да гэтага самага кіруюцца польскія дзеячы у Віленшчыне і Горадзеншчыне.

Усім ясна, што як кажа французкая прыказка: l'appétit vient en mangeant! *)

На усё гэта мусім сказаць, што залічаньне частак Беларускае Зямлі да Польшчы, калі народ ўвесь не высказаўся, калі больш чым палова паветаў беларускай прыфронтовай тэррыторыі, як бежанцы, дагэтуль дамоў не вярнуліся і сідзяць так у Расеі як і на Украіне і на Каўказе і у Сыбіры — усё гэта вялізарная несправядлівасьць, зьдзек і чысты гвалт.

Гутаркі ня можа быць аб тым, што народ наш згодзіцца, каб распараджаліся ім без пытаньня.

Часы старога уціску прайшлі і ня вернуцца. Народ за час вайны шмат чаму навучыўся, прасьвятлеў на вочы і зрабіўся сьвядомым. Памагалі беларускаму народу прыйсьці да сьвядомасьці ўсе малыя і вялікія народы б. Расеі. Першае мейсца тут маюць нашыя сапраўдныя браты-украінцы. На террыторыях гэтых народаў паўставалі беларускія арганізацыі, клюбы і г. п.; і ўсе нацыі Расеі цікавіліся гэтым, віталі беларусоў, пажадаючы ім сьветлай будучыні у нацыональна гасударственнай незалежнасьці. Аб панах паляках і памаганьні праз іх беларускаму руху мы ня чулі і ня бачылі, як і цяпер гэтага не бачым і ня чуем.

Польская прэса, польскія статысты і палітыкі шмат пішуць аб нас, але усё тое без вартасьці, бо не апіраецца на праўдзівай знаёмасьці гэтага палітычнага і грамадзянскага шляху, які ужо беларусы прайшлі.

Тут скора выкажацца гэтая незнаёмасьць кіраваньняў беларускаго народа да свабоды, калі толькі прыйдзе да укладаньня варункаў узаемных адносін. Мы больш чым перакананы, што паны палякі узьдзівяцца толькі тады, калі пацерпяць маральнае паражэньне, якое напэўна выйдзе з незнаёмасьці дзяржаўных кіраваньняў нашага народу.

Нам кажуць: ці вы можаце аснаваць гасударство, калі вас беларусаў інтэллігэнтаў такая жменька?

Знамянітая, кляссычная інформацыя аб беларусах газэты „Dziennik Wileński“ з яго „канапкай“ служыць ясным довадам, якая сьлепата пануе яшчэ пасярод інтэлігентных навет і прыязных нам польскіх палітычных кругоў!

Так, паночкі! Мы сьмела кажам, што збудаваць сваю Беларусь здалеем, што працы гэтай не баімося, што значэньне і вагу яе добра і сьвядома цямім! Толькі мы ня думаем тварыць нейкай *панскай* Беларусі. Істнуюць жа мужыцкія гасударствы, як Нарвэгія і Баўгарыя і, здаецца, жывецца ім нішто. Такое самае мужыцкае гасударство можам і мы сатварыць.

На гэта хопіць нам і сіл і людзеў, бо хіба і ніхто спрэчацца ня будзе, што беларусы, навет самыя цёмныя і неграматныя, стаяць куды вышэй, чымсьці баўгары у 1877 гаду, каторые аднака незалежнасьці дабіліся.

Вось дзеля таго усяго, што тут сказано, мы і будзем падтрымоўываць і свой Урад: Раду міністраў і усе Рады Беларускае Зямлі.

Раздзяленьня Беларусі мы ня хочам і будзем бароцца проціў таго, каб адну ці другую частку цягнула да сябе Маскоўшчына ці Польшча. Добра ведаем, як выглядае такі Пьемонт і якая бяда была бы з творам Alba Ruthenia irredenta, і гэтага ня хочам.

Кіруемся і кіравацца будзем толькі да суцэльнай, непадзельнай і незалежнай Беларусі!

Хай жыве і красуе вольная, непадзельная і незалежная Беларусь!

Раман Суніца.

*) Апэтыт зьяўляецца у часе яды.

З прыгоды двохлікасьці, якая здаецца.

Дзіўное ўражаньне на чалавека цьвярозага і грунтоўна знаёмага з сусьветнай гісторыяй наагул і з гісторыяй Вялікага Князьства Літоўскага ў асаблівасьці—робяць і пастановы Сойма і усе газэтныя артыкулы польскай прэсы. А можа быць, што разьюшоная нездаволеннасьць E. S.

(„Nasz Kraj“ № 27) літоўскаю стацьцёю „Ведае лявіца, што дзеіць правіца“—навет і зусім шчырая... Бо трэба-ж лічыцца з псіхалёгіяй людзей, каторыя болей за паўвека толькі ж і лятуцелі аб уваскрашэньню свае бацькаўшчыны; каторым ад самага маленства убівалі ў галаву, што іх народ — „naród bohaterów“, што яны бязьвінна сталі ахвяраю хцівых суседзяў, што без віны яны несьлі цяжкі крыж няволі і д. т. п. Тымчасам, праўда, з польскай навет крыніцы, як ганячых казаньняў Скаргі, розных мемуараў і гісторычных сачыненьняў Крашэўскага, ясна вілаць, што Польшча пагінула за сваю анархію, шалёнае панства і расхадовасьць сваіх магнатаў, каторыя свае вялізныя даходы кідалі на вецер у дварэ і закардонам, тады як палажэньне іх селян—немаючага правоў і голасу, хаця аднэй расы і аднэй з імі веры „быдла“—нагадывала палажэньне эгіпецкіх феллахаў. Тымчасам, праўда, ясна, як дзень, што дужое Вял. Князьст. Літоўскае (што абхаплівала і Беларусь і Украіну), на вялікіх абшарах каторага да уніі, як у Маскоўскім гаспадарстве да Барыса Годунова, не было паншчыны, што яно, дзякуючы наплываньню польскага элементу і польскіх парадкаў, было уцягнута у польскую анархію у самы блажэйшы занепад і борздае раськіданьне Рэчы Паспалітае. А дзякуючы таму ж, чужы польскім панам беларускі і украінскі народ урынуўся пад страшэнны рэлігійны і нацыянальны уціск, пасьледзтвам каторага было, з аднаго боку, апалячэньне вышэйшых станаў і, з другога боку, адтаргненьне ад Польска-Літоўскага гаспадарства Украіны. Гісторыя ж Літвы і Беларусі у 18-м веку — адзін усьцяжны жах бязправаваньня, разору, рэлігійнай ганьбы і слаўных „наездаў“.

Гэта быў гэткі час, што негія маткі-полькі пільненька намагаюцца схаваць аб ім усякія весткі ад сваіх дзетак, каб ня ведалі праўды. А горкая гэтая праўда галасіць, што якраз гэная анархія, сваволя безпардоннай шляхты, што ішла поруч з немагчымай згубай сумленнасьці у вышэйшых клясах і немагчымым згаленьнем ніжэйшых клясаў, што яна і паслужылася, як прычына занепаду, а рэлігійная нецярпімасьць палякоў паслужылася суседам Польшчы, як прычэпка, каб убунтавацца ў яе справы і нарэшці падзяліць яе.

Але хто затуманіўся усосаным з млекам маткі *сьляпым* патрыотызмам, alias шовінізмам, той проста-на-проста ужо маецца ня ў здольнасьці меркаваць цьвяроза, безстаронна, справядліва, і ад гэтага і выходзе тое дзіўное ўражаньне, аб каторым я кажу!

У аднэй і тэй-жа газэці, да прыкл., пішуць: „Мы чужога не патрэбуем. Польшча не адбірае у Літвы і Украіны права на незалежнасьць“—і тут жа у кождым артыкулу сьвіціцца цьвёрдае пераконаньне, што землі б. Вялікага Князьст. Літоўскага зусім ня чужое, але спрадвечная ўласнасьць Польшчы. І толькі баючыся Антанты давозяць Ліцьве і Беларусі—страшачы іх то Маскоўшчынай, то Нямеччынай і навет Англіяй—канечна сьцісла злучыцца з Польшчаю... А быццам мы ня ведаем, што польскія шовіністы ніколі не лічылі і ня будуць лічыць ліцьвіноў, беларусаў і украінцаў роўнымі сабе і усягды захочуць панаваць над намі. А як быццам мы ня ведаем, што яны, засьцерагаючы нас ад германскай колёнізацыі, самі жычліва і гарліва прапаведуюць „польскую“ колёнізацыю на нашых „абшарах“. Дзіўным мне таксама здаецца, што E. S., ухваляючы Англію за „падарованую“ Ірляндыі незалежнасьць, у гэтым знаходзіць аналогію паміж Польшчаю і Літвою (!!) і аднак жа канчае свой артыкул наказаньнем на унію, г. ё. прапазыцыяй самахоць улезьці у ярмо, ад каторага, як быццам, ужо пазбавілася Ірляндыя. Пры усім гэтым я аўтараў падобных артыкулаў навет не абвінавачываю у двохлікасьці і наўмысным ўдаваньню, але мне, тото й дзіў, прыходзіць у дум апаведаньне Немоеўскага „Людзі з абвязанымі вачмі“. У ва сьне ён апынуўся у вялікім месце, дзе людзі насілі на вачох разнаколерныя абвязкі з празрыстай тканіны, дзеля чаго бачылі усё толькі у такім ці ў гэткім афарбаваньню; фабрыканты абвязак, хаця ж і не ладзілі і ішлі на перабой адзін з адным, але усягды дружна узьнімаліся проці тых людзей, якіх было трошку, што не хацелі іхных абвязак і уважалі за лепшае бачыць рэчы такімі, якімі яны ёсьць сапраўды.

А. Р.

Пратакол Агульнага Сходу Беларусаў м. Вільні 25-га мая 1919-га году у залі 1-ае Беларускае гімназыі.

Старшыня Беларускай Рады у Вільні грам. Кахановіч аглашае павестку дня:

1) Агульна-палітычнае палажэньне.
2) Арганізацыя і выбары Белар. Нацыян. Каміт. у Вільні.
3) Разьвіцьце коопэратываў і прафэсыян. саюзаў сярод беларусаў.
4) Бягучыя справы.

Сабраньне выбірае прэзыдыум у складзе гэткіх асоб: старшыня гр. Аляксюк, та

Навуковыя гутаркі*)

а міжнародным судзе.

(Увагі на пытаньне аб Лізе Народаў).

4.

Калі пакінуць сярэднявечную старасьветчыну, то першая умова а міжнародным трэцейскім судзе была паміж Англіей і Злучанымі Штатамі ў канцы XVIII в. дзеля рэгуляцыі канадскае граніцы. На працягу усяго пасьледуючага сталецьця лік такіх умоваў паміж рознымі гаспадарствамі увесь час узрастаў (выключаючы рэакцыйнае ва ўсіх адносінах дваццацьпяцьлецце 1815—1840). Канец веку азначыўся паўстаньнем новага тыпу трэцейскае умовы. Калі раней умовы аграничываліся перадачай на трэцейскі суд асобных, конкрэтных спораў, то цяпер зьявіліся умовы агульнага характару, прадпісываючыя трэцейскае разгляданьне цэлых грамад спраў, як істнуючых, так і тых, што могуць паўстаць у будучыне. Так зрадзілася ідэя абавязковага трэцейскага разбору.

Ці вялікі-ж быў ў дні перадвоенныя поступ гэтае міратворчай судоўнай думкі?

У даволі густой сеці трэцейскіх умоў, што аплятали земляную кулю, можна адрозьніць чатыры асноўныя тыпы.

Першая грамада умоў аддае да абавязковага трэцейскага суду толькі так званыя чыста юрыдычныя рознагалосься: споры аб талкаваньні.

Да гэтага умовы другой грамады далучаюць яшчэ агаворку: усе гэтыя пытаньні належаць да трэцейскага суда, *калі* яны не чапаюць „чэсьці і жыццёвых інтэрэсаў“ умаўляючыхся гаспадарстваў (гэтак станововчая эпоху англо-французская умова 1903 г.)

Тутака, значыць, усе хоць колькі сурьёзныя палітычныя конфлікты ужо спаўна выймаюцца с-пад міратворчага уплыву суду.

Далей ідуць тыя умовы, што кажуць аб *усіх*, ня толькі „юрыдычных“ спорах, але з такою-ж агаворкай об „чэсьці і жыццёвых інтэрэсах“.

Урэшці, найбольш паступовая чацьвертая грамада умоваў: на суд аддаюцца усе супярэчкі бяз усякіх агаворак. Учасьнікамі умоваў гэтага тыпу — гэта малыя гаспадарствы (прыклад: умова паміж Галляндыей і Італіей).

Не да усьцешных думак прыводзіць гэты перагляд удач Тэміды: падставы праўнага суду перамаглі толькі на такіх пунктах, за якія войн не бывае, альбо ў адносінах між гасударствамі, якім наагул няма за што ваяваць.

Рупна бароначы ад агню гаспадарскія будынкі, у якіх знаходзіцца, ведама-ж, вельмі цэнная маемасьць, істнаваўшая дагэтуль сыстэма трэцейскіх умоў пакідала бяз увагі парахавыя склады.

5.

А гаагскія мірныя конфэрэнцыі?

Ці не павінен быў перадастатні год мінулага сталецьця—год склікання першае з іх—зрабіцца эрай новай гісторычнай эпохі, эрай доўга жаданага ўцёленьня сьвета — соўнечнай думкі: супакой усяму сьвету? І калі супакою паміж народамі нельга думаць без міжнароднага суду, то—расчыняючы дзьвері для гэтага гасьця з чароўнага каралеўства—ці-ж не павінна была, столькі ўжо наглядзеўшыся на сваім жыцьці, прыдзьверніца, бабулька Гісторыя, усклікнуць урашці:

— Суд ідзе!

І сапраўды, зышоўшыся у голландскай сталіцы, сьветачы навукі і дыплёматы блізка ўсіх гаспадарстваў зямлі вялікшую частку дужа труднай сваей дарогі даканалі ў орбіце цікавячага нас прынцыпу абавязковага трэцейскага суду.

Але, перш-на-перш: прынцып гэты быў ад самага пачатку абязплоджаны усё гым самым з'вужаньнем яго да ведамых ужо нам, без усякага палітычнага зьместу, граніц чыста «юрыдычных» спораў.

Другое, што ўсе стараньні умацаваць аснову праўнага суду хоць бы толькі у гэтым скромным абсягу засталіся дарэмнымі: адпаведнай коллектыўнай умовы, абымаючай усе прадстаўленыя на конфэрэнцыі гаспадарствы, зрабіць не ўдалося. Для таго, хто цікавіцца кондуітным журналам, заўважым, што ў гэтай справе заслугу за першы пачатак мае Расея, а незавідную чэсьць нязломнага супраўціленьня, што пагубіло усю справу — Гэрманія.

Як блізка было да нуля практычнае значэньне прынятых у Гаазе паста-

*) Гл. № 10.

вар. старш. гр. Сакалова, сэкрэтар гр. Чарняўская.

Старшыня, гр. Алексюк, адчыняе сход, прамовай аб бягучым мамэнту. Ен кажа, што беларускі народ адраджаецца, што ён даўно ужо шукае свае незалежнасьці. Яшчэ ў сьнежню 1917 году на Усе-Беларускім зьездзе у Менску Беларускі народ праз сваіх прадстаўнікоў сказаў свае слова аб тым, што ён мае права быць гаспадаром на сваёй зямлі. Цяжкія часіны перажывае Беларусь. Увесь гэты час яе тэрыторыя окупавана тымі ці іншымі чужымі войскамі. Беларусы, Белая Русь заўсёды з усімі сваімі суседзямі жыла згодна. З даўных часаў свайго разьвіцьця Беларусь была цесна звязана з літоўцамі: літоўскі народ—самы блізкі брат беларускага народу. І польскі народ беларусы лічаць за свайго брата. У польскім Сойме ёсьць тэндэнцыя анэксіраваць беларускія землі; верыцца ў розум польскага народу, хочацца верыць адозве Вярхоўн. Начальн. Польскага Гасударства п. Ю. Пілсудзкага, ў каторай ён пісаў, што палякі прышлі да нас як роўныя да роўных, вольныя да вольных, вызваліць з пад чужазем нага уціску і г. д. Беларусы ніколі з ні кім не ваявалі і з усімі шчыра хочуць захаваць добрыя адносіны. Што датычыць братняга велікарускага народу, то верыцца, што народ велікарускі зразумее нас. Перш. лепшыя сыны вялікарускага народу не разумелі беларусаў, але гэта адносілась да ўсіх нездзержаўных народаў. Цяпер ёсьць пэўнасьць, што у будучыне народ велікарускі будзе жыць у згодзе з беларусамі.

Прамоўца яшчэ раз падкрэсьляе, што беларускі народ сказаў сваю волю: ён хоча быць свабодным, ні ад кога незалежным; ён ня хоча чужога, ён хоча свайго. Але ня трэба абмяжаць сябе словамі, трэба мець рэальную сілу, трэба згуртаваць усе актыўныя сілы. Усе, у кім б'ецца сэрца беларуса, павінны прыйсьці на помач. Няхай будуць праклятыя тыя інтэлігэнтныя сілы, каторыя здрадзяць свайму народу.

Нарэшце прамоўца прапануе сходу прыняць рэзалюцыю аб незалежнасьці і непадзельнасьці беларусі і просіць абы-каго з прысутных выказацца па гэтаму пытаньню.

Слова бярэць грам. Душэўскі.

Прамоўца кажа, што старшыня сходу, гр. Алексюк, намэціў рамкі той дарогі, па каторай мы павінны йсьці, і сам падкрэсьляе, чаму беларусы павінны дамагацца незалежнасьці і непадзельнасьці. Цяпер Беларусь фактычна падзелена на 6 частак: часткa Магілёўшчыны і Міншчыны далучана да Украіны, часткі Гродзеншчыны, Меншчыны і Віленшчыны да Польшчы, часткі Віленшчыны і Гродзеншчыны да Літвы, Смаленшчына і частка Вітэбшчыны да Заходняе Камуны, другая частка Вітэбшчыны да Паўночнае Камуны, частка Міншчыны да нейкае Беларускае Рэспублікі. Кожная падзеленая частка Беларусі лічыцца, як акраіна, і абіраецца другімі дзяржавамі. Кожны з окупантаў лічыць сябе „начальствам“ і хоча, каб усе жыхары яго слухалі, а ня тое—пасадзіць няслухняных туды, куды яму трэба, але ім ня трэба. Беларускаму народу канечна патрэбна незалежнасьць і непадзельнасьць. Гэтыя словы прамоўца падкрэсьляе.

Падтрымовываючы Раду Беларускае Нар. Рэспубл. і Раду Міністраў, мы становімся з імі на грунце незалежнасьці і непадзельнасьці Беларусі і будзем дамагацца гэтага ўсімі сіламі.

Сярод прысутных знаходзіцца палкоўнік Белар. палку гр. Езавітаў.

Старш. сходу пытае у прысутных, ці ня хочуць яны паслухаць даклад палкоўніка аб Белар. палку у Горадні. Увесь сход просіць палк. Езавітава зрабіць даклад і вітае яго падоўгімі апладысмэнтамі.

(Далей будзе).

АПОШНІЯ НАВІНЫ.

Весткі Польскага Генеральнага Штабу.

24-га мая.

Литоўска-Беларускі фронт.

На паўдзён-усход ад Пінска па заўзятай бойцы бальшавікі адкінуты за Прыпяць з вялікімі ля іх стратамі.

Гішпанія прызнае незалежнасьць Польшчы.

У адказ на ноту Падэрэўскага гішпанскі урад прызнае незалежнасьць Польшчы і польскі урад.

Венгерска-румынская вайна.

Венгерскі полк пяхоты перайшоў раку Цісу і адкінуў непрыяцеля. На поўнач ад Кішкоро румыны намагаліся шмат дзе перайсьці Цісу, але ня здолялі.

На Петраград.

Бальшавіцкае войска па ўсей лініі ад Наровы да Петраграду адступае. Эстонскае войска заняло важны пункт за 50 вёрст ад Петраграду. Бальшавікі ўжо ня маюць с Петраградам ніякага зьвязку. Ангельскае войска выйшла на бераг у порце Дуга і заняло колькі мяйсцовась-

ноў, відаць з таго выкладу, які робіць з юрыдычнай мовы на звычайную ведамы вучоны, праф. Б. Нольдэ:

„Гаспадарствам,—кажа ён без ўсякай надуманай іроніі,—не бароніцца, калі яны таго пажадаюць, перадаваць на разгляд трэцейскага суду тыя споры юрыдычнага характару, якія, згодна з іх думкай, такую перадачу дапускаюць“.

Калі, такім парадкам, установіць абавязковы трэцейскі суд не ўдалося, ўсё-ж ад першае гаагскай конфэрэнцыі (1899 г.) засталася, на пагляд, такая установа, на суд якой гаспадерствы маглі па добрай волі аддаваць споры, што паўстаюць паміж імі: гэта—„Палата трэцейскага суду“. Быцьцё такой установы, навет пры неабавязковым зварочаньні да яе, усё-ж азначала-б неякае палепшаньне міжнародных звычаяў: аўторытэтнае судовае мейсца, зложанае з лепшых юрыстаў сьвету, заўсягды адкрытае для безстароннага разгляданьня міжгаспадарскіх спораў, заўсягды гатовае аддаць павіннае кожнаму юрыдычна абаснованаму дамаганьню, самым фактам свайго быцьця заўсёгды напамінала-бы гаспадарствам, якія спорацць, аб адно-толькі дастойным для культурнага чалавецтва спосабе разсуджаць праўныя супярэчкі, сілаю псыхолёгічнага уплыву пабуджала-б іх уступіць на судоўную сьцежку і было-б, гэтак кажучы, жывой папікай для нязгодлівых, што сходзяць з гэтае дарогі.

Але і гэтая установа была толькі відзімасьцю. „Палата трэцейскага суду“ запраўды была зусім не «палатаю», а тыкеля спіскам кандыдатаў у трэцейскі суд. З гэтага спіску [illegible] хацелі завясьці трэцейскі разбор, маглі выбіраць склад суду, які ствараўся кожны раз спэцыяльна дзеля данае справы; і, такім чынам, толькі тады, калі умова аб арбітражы ўжо даканалася і толькі посьля таго як доўгая процэдура назначэньня трэцейскіх судзьзей закончылася, насіцель міжнароднага суду паказываўся на сьвет Божжы; дагэтуль перад вочамі міжнароднай грамадзянскай думкі было не „аўторытэтнае, судоўнае“ а ўсяго толькі — пустое мейсца.

Вялікі сіг наперад ў гэтых адносінах манілася зрабіць другая гаагская конфэрэнцыя 1907 г. Там быў выпрацованы і прыняты праэкт „Сталае Палаты“— міжнароднай судоўнай установы з сталым складам асоб, для створаньня якога ня трэба было зусім учасьця самых гаспадарстваў, што спорацць. Гэта была прынцыпіяльная і плоцная навіна: аснова выборнасьці судзей самымі спорщчыкамі першы раз касавалася і, дзякуючы гэтаму, дасягаўся падвойны рэзультат. На мейсцы эфэмэрных, у самым быцьці сваім ад споршчыкаў залежных, дзеля кожнае асобнае справы робленых і разам з нею зьнікаючых трэцейскіх магістратур становіўся сталы орган, ў абы які момэнт гатовы прыступіць да судоўнае работы.

Апроча таго узрастала ўнутраная аўторытэтнасьць суду: як бы ня была-б чыстай моральная фізыёномія выбарных трэцейскіх судзей, яны ня могуць ня чуць неякай залежнасьці ад назначыўшай іх стараны; а новы парадак устройства суду, адкідаючы прынцып выбар- гэтага псыхолёгічна неабходнага націску і ствараў новую гарантыю судзейскае безстароннасьці—незаменнай умовы красаваньня кажнае юстыцыі.

Але—і тутака далей добрых жаданьняў справа не пашла: дзеля тэхнічнае немагчымасьці ўздавольніць дамаганьня лічных малых гаспадарстваў, жадаўшых для сябе аднолькавага з вялікімі дзяржавамі ліку мейсц ускладзе суду, увясьці праект у жыцьцё не удалося.

6.

Напамінаем яшчэ раз: навет і пры зьістнаваньні праекту „Сталай Судоўнай Палаты“, сьвет які-бы заблішчэў з. Гаагі, быў-бы вельмі цьмяным, за тое што прынцып абавязковасьці самага зьвяртаньня да суду прызнаны ня быў. Тая крыха, што тутака была дасягнута перад сусьветнаю вайной, як сказана вышэй, у раз. 4., не выходзіла з граніц часных умоў паміж асобнымі гаспадарствамі.

І расшыраньне добра-дзейнага уплыву суду за граніцы друга-радных „юрыдычных“ спораў і створаньне заместа многіх партыкулярных трэцейскіх умоў ядынай сыстэмы міжнароднага судаводства засталося ідэалам будучага.

Ідэалам недасьціглым — цьвярдзілі ўплывовыя галасы з стану учоных знатакаў міжнароднага права. Важнейшыя, насычаныя політычнаю электрыкай, супярэчкі, згодна з думкаю прадстаўнікаў гэтага скептычнага погляду, дзеля самае сваей натуры не паддаюцца судоўнай ацэне: яны выклікаюцца нязгодаю асноўных гістарычна [illegible]

цяў на берагу ракі Дугі. Паміж сябрамі радаў вялікі неспакой. Бальшавікі кажуць, што будуць бараніць Петраград да канца, і калі-б ген. Маннэргэйму ўдалося ўзяць Петраград, дык ён знойдзе тамака толькі руіну.

Тэлеграмы з 24 мая паказываюць, што войскі, якія йдуць праціў Петраграда, на захадзі злучыліся і шыбка йдуць уперад. Частка арміі дайшла ўжо да Краснай Горкі і да прядмесьцяў Петраграда.

У барацьбе з бальшавікамі маюць учасьце і сарганізаваныя ў Архангельску расейскія палкі. У мінулы аўторак у Гатчыне эстонцы ўзялі дабычу: шмат гарматаў і кулямётаў і больш за 1 000 палонных.

Бальшавікі, уцякаючы, забіраюць с сабой насяленьне і ўсё, што толькі могуць узяць.

Узяцьце Рыгі і Ямбурга.

Латышская армія ўзяла Рыгу. Шмат народных камісараў растрэлялі. Латышы ўзялі Дзьвінск.

Эстонскае войска ўзяло Ямбург і йдзе на Вольмар.

Керэнскі проці Колчака.

ГААГА, 16-га мая. Палкоўнік Генко прыняў учора Керэнскага, каторы выказаў гарачы пратэст проці пляну коаліцыі аддаць ўладу ў Расеі у рукі рэакцыянэра Колчака.

Самагубства польскага б. віцэміністра.

24 мая ў Варшаве у палацы Рэчы Паспалітай у сваім габінэці задавіўся б. польскі віцэміністр Язэп Сьвятаполк-Завадзкі.

У Вэнгрыі.

Змова, каб з аружжам у руках ськівуць вэнгерскі ўрад „саветаў", не ўдалася. Арыштавалі сход.

Проціў немцаў.

Ангельская армія ўжо прыгатовілася, каб увайсьці ў Нямеччыну, калі немцы не падпішуць мірнай умовы.

Так сама на ўсеякі прыпадак прыгатоўлена і амэрыканская армія.

У ВІЛЬНІ.

Загад улады.

Генэральны Камісар даў загад у справе сходаў і сабраньняў, у якім між іншым гаворыцца, што уселякія сходы можна рабіць толькі атрымаўшы паваленьне на гэта улады; прамовы гаварыць на сходах, канфэрэнцыях ды інш. можна толькі ў **адной з маёсцовых моў**; на сход будзе зьяўляцца прадстаўнік улады, які мае права зачыніць сход, калі будуць непарадкі, або будзе парушаны публічны супакой, або калі прамоўцы будуць казаць аб тым, аб чым не напісана ў просьбі, або калі будуць казаць проціў улады, або проціў польскага войска, або калі будуць клікаць чыніць гвалты і непарадкі.

Вінаўныя апрача адказнасьці ў судзе будуць пакараны штрафам да 3.000 марак або турмой да 2 месяцаў.

Сход беларусаў жыхараў м. Вільні адбыўся 25-га мая. Сход прыняў рэзолюцыі: 1) аб незалежнасьці і непадзельнасьці Беларусі; 2) аб сформіраваньню нацыянальнага беларускага войска; 3) аб немарудным вызваленьню арыштаваных німа ведама за што беларусаў; 4) аб невыкіданьні са службы беларусаў, што ня ўмеюць польскай мовы; 5) аб арганізацыі беларускіх школ і тэатра; 6) аб разьвіцьцю кооперативаў і інш. Сход абраў Беларускі Нацыянальны Комітэт, у склад каторага увайшлі прадстаўнікі пачтавікоў, чыгуншчыкаў, вучыцялёў, вайсковых, каталіцкага і праваслаўнага духавенства і інш.

„Беларускае жыцьцё"-новы ілюстраваны двохтыднёвы журнал у беларускай мове выйдзе ў сьвет у канцы гэтага тыдня.

Беларускі тэатр незабавам адчыніцца у Вільні. Бліжэйшае учасьце прыймае артыста Ждановіч, каторы надоячы прыйшоў з Менска. Даставаць спраўкі і запісывацца у хор можна у „Беларускай Кнігарні", Завальная, 7.

Літоўска-беларуская дэлегацыя у складзе асоб: д-ра Шауліса і палкоўнікаў Езовітава і Велікаса заездам з Варшавы была 25-га мая у вышэйшай польскай віленскай ўлады, а 27 га мая выехала у Коўну.

Газэта у рускай мове прызнана тутэйшаю ўладаю, як рэч без пары і без праўдзівай патрэбы у тутэйшым жыцьці.

Перапускі на выезд з Вільні, дзеля розных новых формальнасьцяў у палявой жандармэрыі, выдаюцца не раней, як дзён праз 7—8 апасьля падаваньня заявы.

Харчы.

Мукі 9 хунтаў, што не дадалі за май, дадуць на гэтым тыдню.

Воцэту па флакону дадуць у гэтых днях.

Сала за май, па хунту на чалавека (8 руб.), у іншых крамах ужо даюць з учорашняга дня.

цігнуць, ў лепшым разе, толькі дыплёматычнаю дарогай, цаною розных уступак і компромісаў, або, ўгоршым разе, сілаю аружжа. Гэтакімі ёсьць тэрыторыяльныя дамаганьні з нацыянальных або экономічных поглядаў — напрыклад дамаганьне Італіі аб поўночна-ўсходнім узьбярэжжы Адрыятычнага мора, вялікасэраскія, або румынскія дасяганьня ў Вэнгрыі, вельмі зблутаная зложнасьць тэрыторыяльных дамаганьняў розных балканскіх гаспадарстваў. Так сама трэтэнеіі некаторых дзяржаў на кіраўнічую ролю ў адсталых і слабых старонках, як напрыклад у Кітаі, у Пэрсіі і г д.

Наадварот, оптымісты думаюць, што ня можа ў люцкік, а значыць і ў міжнародных адносінах паўстаць такі спор, да якога нельга было б прылажыць праўнай, а, значыць, і судоўнай ацэны. Ідэя права абымае ўсё, і усякая прэтэнсія, кожнае дамаганьне, можа быць праведзена цераз горан суду; другое, канешна, пытаньне—ці выйдзе яно адтуль загартованым ці на попел абвернецца. Дзеля гэтага няма прычыны безнадзеіцца; паступенны прогрэс прывядзе і ў міжнародным жыцьці да такога трыумфу праўнага суду, да якога дайшоў её—гісторыкі ведаюць, бкой доўгай дарогай—ва ўнутронагаспадарскім быцьці.

Ня будзем углыбляцца у гэты вучоны спор. Скажам толькі, што падданьне усяго міжнародна - палітычнага жыцьця строгім асновам права, запраўды вымагала-бы, відна, вялікай работы на перамену і палепшаньне істнуючых міжнародных адносін. Адзін з жыцьцёвых прыкладаў—пытаньне аб доступе да мора. Напомнім, затым, а трывожнай астраце нацыянальнага момэнту ў яго значаньні для міжнародных адносін, у асобнасьці—а проблеме ірредэнтызму. Для разьвязаньня такіх заданьняў навука пакуль што яшчэ не знайшла ключа. Некаторыя рэцэпты, што на першы пагляд падкупляюць сваім дэмократызмам, пры больш глыбокім разгляданьні выклікаюц важкія сумненьні. Гэтак, узвясьці плебісць на ступеню *сталага* юрыдычнага інстытуту, функцыянаваньнем якога азначаласьбы працягласьць дзяржаўных граніц розна-плямённых гаспадарстваў, можа быць, было-б небязпечным для міжнароднага супакою і парадку: які ўдзячны грунт стварыўся б для распаліваньня нацыянальнай гарачкі, якія інтрыгі, якую нягодную ігру на націягнутых струнах нацыянальнай сьвядомасьці пачалі-б пасвараныя дзержавы, якая „македонізацыя" гразіла-бы міжнароднай палітыцы*).

Але, паўтараем, нам віма чаго углыбляцца у гэтыя проблемы. Заўважым толькі, што для найбліжэйшага часу яны ня маюць палітычнае жыцьцёвасьці. Нельга заплюшчываць вочы на праўду: сьвет заняты цяпер не разьвязваньнем пытаньняў права а перабудовай усяго міжнароднага укладу на аснове мэце, адпаведнасьці. І можна толькі пажадаць каб мэты пры гэтым назначаліся не залішна нізкія... У англіцкай формуле ваенных мэт, у знанай програме «трох R» (Restauration, Retribution, garanties agaiust Repetition), якую па беларуску можна выказаць бадай што як праграму „трох А" — „Адбудоба Адданьне (за шкоды зробленыя вайной), гарантыі проціў Аднаўленьня вайны" першыя два суставы, можа быць, зьмясьціліся-б у рамкі узноўленьня стоптанага права; але куды важней трэцяя частка формулы: яна пасьвячаецца „умацаваньню сталага супакою", ў яе мэце—адпаведным спаўненьні — гісторычная міссія нашага часу і адзываецца яна шмат больш да палітычнай празорнасьці, як да праўнае сьведамасьці сучасных гаспадароў лёсу ўсяго сьвету, якія апіраюцца на сілу ваеннае моцы.. Ідзе перадзел гісторычных ролей, перамяшчэньне цэнтраў палітычнае і экономічнае моцы; і толькі, як закончыцца гэты разум будуючы і руйнуючы процэс, таді ёзноў мені зміць свое значаньне *абаронныя* асновы права і суду.

(Далей будзе).

Андрэй Барскі.

*) Аўтор мае на ўвазе толькі значэньно плебісцыту, як сталаю, разлічанага на нармальныя часы інстытуту і зусім не адносіцца да палітычнай ролі яго ў пераджываны выключны момэнт эўропэйскае гісторыі, які вымагае радыкальных мер для аканчальнага ўздараўленьня нацыянальна-палітыч-